Палажэнне
аб правядзенні конкурсу чытальнікаў «Купалаўскія чытанні»,
прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы
раённага фестывалю сямейнага адпачынку і здаровага ладу жыцця «Гарбата па-сваякоўскі» у рамках Года гістарычнай памяці

1. Агульныя палажэнні

Дадзенае палажэнне вызначае мэты і задачы, правілы, удзельнікаў, тэрміны і парадак правядзення конкурсу чытальнікаў «Купалаўскія чытанні», прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы (далей – конкурс).

Конкурс «Купалаўскія чытанні» праводзіцца 18 чэрвеня 2022 года на малой канцэртнай пляцоўцы ў аг. Усход Магілёўскага раёна.

2. Арганізатары конкурсу:

Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага раённага выканаўчага камітэта;

ДУК “Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк”.

3. Мэты і задачы:

- выхаванне ў насельніцтва нацыянальнай самасвядомасці, патрыятызму, любові да сваёй Радзімы;
- павышэнне цікавасці насельніцтва да культурнай спадчыны свайго народа, традыцый, гісторыі культуры роднай краіны;
- выхаванне падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры;
- развіццё мастацкай творчасці насельніцтва.

4. Умовы ўдзелу ў конкурсе

У конкурсе могуць прыняць удзел усе жадаючыя дарослыя і дзеці.

Неабходна падаць заяўку на ўдзел у фестывалі не пазней за 10 чэрвеня 2022 г. на электронную пошту rcbs.buin@yandex.by з пометкай: заяўка для ўдзелу ў конкурсе чытальнікаў – фэстывалю «Гарбата па-сваякоўскі».

5. Парадак правядзення конкурсу:

- афіцыйная частка;
- конкурснае выступленне;
- абмеркаванне, падвядзенне вынікаў;
- узнагароджанне.

Конкурс праводзіцца па намінацыях:
- Лепшы чытальнік вершаў Я.Купалы ў выкананні дарослых;
- Лепшы чытальнік вершаў Я.Купалы ў выкананні дзяцей.

Удзельнікам прапануецца выразна прачытаць вершы або ўрыўкі з паэтычных твораў Я.Купалы працягласцю да 2-3 хвілін.

6. Крытэрыі ацэнкі конкурсных выступленняў:
- веданне тэксту на памяць;
- адпаведнасць прадстаўленага твора тэматыцы конкурсу;
- выразнасць чытання;
- эмацыйнасць і артыстычнасць;
- знешні выгляд удзельніка, вітаецца выкарыстанне элементаў.

7. Падвядзенне вынікаў конкурсу і узнагароджанне пераможцаў:

Выступленні ўдзельнікаў конкурсу ацэньвае журы. У склад журы конкурсу уваходзяць бібліятэкары ДУК “Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк”. Пераможца выяўляецца найбольшай колькасцю набраных балаў.

Рашэннем журы вызначаюцца пераможцы ў дзвюх намінацыях сярод дарослых і дзяцей з уручэннем дыпломаў 1-ай, 2-ой і 3-яй ступені адпаведна, а таксама ўручаюцца дыпломы ўдзельніка.

За актыўны ўдзел у конкурсе па рашэнні журы могуць уручацца заахвочвальныя дыпломы.

8. Інфармацыйнае забеспячэнне конкурсу:
- правядзенне конкурсу шырока асвятляць ў сродках масавай інфармацыі, разаслаць палажэнне ва ўстановы бібліятэк Магілёўскай вобласці;
- інфармацыя аб правядзенні і выніках конкурсу будзе размешчана на сайце дзяржаўнай установы культуры “Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк”.

Да ўвагі: Аплата пражывання, транспартныя расходы і харчаванне ўдзельнікаў ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

Тэлефон для даведак (8 0222) 71-20-77

Заяўка на ўдзел
у конкурсе чытальнікаў
«Купалаўскія чытанні», прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы
раённага фестывалю сямейнага адпачынку і здаровага ладу жыцця «Гарбата па-сваякоўскі» у рамках Года гістарычнай памяці

Ф.И.О. участника (полностью, без сокращения)	
Название произведения	
Хронометраж (затраченное время на прочтение произведения)	
Место работы/учёбы, должность, полностью	
Мобильный телефон	
Дата подачи заявки	
Подпись участника, родителя или совершеннолетнего участника	С положением ознакомлен, согласен, претензий не имею.

Дадатак 1
да Палажэння аб правядзенні конкурсу чытальнікаў
“Купалаўскія чытанні”

Арганізацыйны камітэт
конкурсу чытальнікаў «Купалаўскія чытанні», прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы

1.	Жукава Ала Віктараўна	Загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
2.	Пятроўская Алена Мікалаеўна	Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
3.	Мурачова Крысціна Аляксандраўна	Бібліятэкар I катэгорыі аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
4.	Ісачанка Ірына Мікалаеўна	Бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
5.	Масюціна Ганна Уладзіміраўна	Бібліятэкар II катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
6.	Шынкарова Таццяна Леанідаўна	Бібліятэкар II катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»

Дадатак 2
да Палажэння аб правядзенні конкурсу чытальнікаў
“Купалаўскія чытанні”

Склад журы
конкурсу чытальнікаў «Купалаўскія чытанні», прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы

1.	Лялікава Вольга Васільеўна	Дырэктар ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
2.	Бондзікава Галіна Уладзіміраўна	Намеснік дырэктара ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
3.	Жукава Ала Віктараўна	Загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
4.	Пятроўская Алена Мікалаеўна	Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
5.	Мурачова Крысціна Аляксандраўна	Бібліятэкар I катэгорыі аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
6.	Масюціна Ганна Уладзіміраўна	Бібліятэкар II катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»
7.	Шынкарова Таццяна Леанідаўна	Бібліятэкар II катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі ДУК «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк»